4. Лахцутко, П. Зачем нужны библиотеки, если все есть в интернете?: интервью с директором Научной библиотеки БНТУ Инной Викторовной Юрик [Электронный ресурс]/ П. Лахцутко // TIMES.BNTU.BY. – 2020. – Режим доступа: https://times.bntu.by/allevents/6776-intervyu-s-yurik. – Дата доступа: 10.03.2021.

5. Опарина, О. Д. Социокультурная динамика университетской библиотеки [монография] / Ред.: О. Н. Богатырева, О. Д. Опарина. – Екатеринбург: издательство Уральского университета, 2010. – 181 с.

6. Печёная, А. В. Массовая работа современных университетских библиотек/ А.В. Печёная// Науч. и техн. б-ки. – 2013. – № 8. – С. 9-16.

7. Трубникова, Н.В. Гуманитарная среда в техническом вузе: применим ли опыт мировых лидеров в отечественном инженерном образовании? / Н.В. Трубникова // Инженерное образование. – № 6. – 2010. – С. 84-87.

8. Хафизов, Д. М. Научная библиотека вуза как культурно-просветительский центр / Д. М. Хафизов, С. Г. Смолина// Библиосфера. – 2017. – № 1. – С. 52-57.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Соловьёва А. В., студент 214 группы
Научный руководитель – Котович О. В.,
старший преподаватель

## РЭГІЯНАЛЬНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ СВЯТКАВАННЯ МАСЛЕНІЦЫ: «ГРОДЗЕНСКАЯ МІСТЭРЫЯ»

Адным з галоўных свят беларускага народнага календара з’яўляецца Масленіца. З праходам на беларускія землі хрысціянства, якое аказала ўплыў на язычніцкія традыцыі, гэта веснавое свята провадаў зімы і сустрэчы вясны пачалі адзначаць на восьмы тыдзень перад Вялікаднем. Гэта адбылося ў сувязі з тым, што паперад святкавання Пасхі (Хрыстовага уваскрашэння), вернікам неабходна правесці сямітыднёвы пост.

У агульнавядомай назвы Масленіца існуюць і іншыя: «…якія ўдакладняюць тыя ці іншыя асаблівасці тыдня: Пусты, Развітальны, Сырны, Крывы, Сырапусны» [2, с. 33].

Старажытнае свята і на сучасным этапе з’яўляецца адным з галоўных святочных падзей нашай краіны. Дзякуючы гэтаму святу моладзь пачынае адчуваць сябе часткай беларускіх традыцый, прывучаецца да духоўнай культуры не толькі самога народа, але і яго ўнутранага багацця. Беларусы заўсёды былі выдатным прыкладам таго, як трэба звяртацца са сваёй гісторыяй і як беражліва перадаваць самабытныя традыцыі, нібы сакральны дар у спадчыну сваім нашчадкам.

У старажытныя часы хутчэй за ўсё Масленіца была звязана з днём вясновага раўнадзенства: «Старажытнаславянская матрыца храналагізацыі абрадавых падзей фіксіравала не толькі фазавыя пераходы дзённага свяціла, але і менш выразныя пераходы з адной пары года ў іншую. Зразумела, што паміж чатырма порамі года адпаведна будзе столькі ж прамежкавых сітуацый, якія павінны суправаджацца такімі ж святочна-абрадавымі комплексамі: Масленіца – паміж зімой і вясной, Сёмуха – паміж вясной і летам, Жніво – напрыканцы лета, Восеньскія Дзяды – паміж восенню і зімой» [2, с. 68].

Адным з язычніцкіх бостваў беларускай культуры была Багіня Мара (Марана, Марэна, Марана, Мармарэна). Можна меркаваць, што ад гэтага пайшлі такія словы як мароз, мор, змрок і інш. Мара-Марана ўвасабляла адначасова і зіму, і кароткачасовую смерць, была бездакорным мярылам справядлівасці, спрыяла добраму ўраджаю. Менавіта яе пудзіла спальвалася на вогнішчы, бо калі гэтага не зрабіць, яна магла загубіць увесь ураджай: «Марэну – смерць, каторая разам з марозамі панавала ўсю зімку над зямлей і людьмі; цяпер ужо скончылася яе панаванне, цяпер ужо прыйшла закліканая Ладава дачка, Лёля, каб панаваць над светам» [1, с. 548]. Абачлівыя беларусы Мару не баяліся, але паважалі. Яе прасілі прагнаць хваробы, якія

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

наступалі з прыходам зімы. Для беларусаў было вельмі важна мець ўрадлівую зямлю, багаты ўраджай і моцнае здароўе.

Святкаванне Масленіцы у кожным рэгіёне мела свае характэрныя асаблівасці, розначытанні, колькасць галоўных удзельнікаў, выкарыстанне адпаведных атрыбутаў. Але была адна агульная рыса ў гэтага свята – магічная, чароўная складовая.

Надзвычай цікавы абрад, сапраўдная містэрыя была зафіксавана у в. Талюшаны Астравецкага раёна Гродзенская вобласці. Даволі падрабязны аповяд С. Я. Казлоўскага, які быў жыхаром гэтай вёскі, стаў амаль што адзіным сведчаннем загадкавага народнага спектакля, які адбываўся ў гэтай вёсцы на масленіцу. У адной з прасторных хат загадзя збіраліся некалькі жанчын. Яны былі сталага ўзросту, сярод із абавязкова павінны былі быць удовы. Удзел у гэтай містэрыі мужчын і моладзі катэгарычна забараняўся. Жанчыны хавалі свае твары пад загадзя прыгатаванымі маскамі, бо нікому нельга было ведаць, хто знаходзіцца ў гэтай хаце. Нягледзячы на тое, што ўсе ў вёсцы ведалі пра гэтую містэрыю, яна была «тайнай", і нікому нельга было нават набліжацца да хаты, у якой будзе адбывацца гэта таямнічае дзеянне. Нават вокны ў хаце завешвалі цёмнымі тканінамі, каб ніхто не мог падглядзець, пазнаць таго, хто у хаце і здагадацца, што там адбываецца.

Жанчыны накрывалі стол святочным абрусам, уключалі лямпу з яркім святлом, запальвалі свечкі і ставілі на стол свае прыгатаваныя загадзя пачастункі, «жартуючы, што ўсяго поўна, а мужыка – ніводнага» [4, 119].

Яны садзіліся за стол і нешта прыгаворвалі, або чыталі замовы, або малітвы, або ціха спявалі «псальм«» (царкоўныя песні). Яны рабілі выгляд, што кагосьці чакаюць. Праз некаторы час у хату заходзіў мужчына, які таксама хавай твар пад маскай «якая адлюстроўвала сваім выглядам нешта таямнічае і замагільнае» [4, 119]. Праз плячо была надзета каробка-сявенька. Яго адзенне было такім, як ходзяць мужчыны увесну. Гэта быў «сейбіт». Жанчыны віталі яго песнямі, жартамі, а самая старэйшая частавала гарэлкай і закускай. Пасля таго, як «сейбіт» пад’еў, жанчыны рассаджваліся па лавах і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ложках, якія стаялі ўздоўж сцен, «а сейбіт пачаў сеяць збожжа, прыгаворваючы нешта. Жанчыны ж смяяліся, падымалі высока ногі і нават спадніцы. Ён жа даволі хутка і асцярожна рассыпаў насенне па току кухні » [4, 120]. На падлогу з торбы «сейбіта» сыпаліся жыта, пшаніца, грачыха, гарох, каноплі, – усё, што маглі пасеяць вясной.

«Сейбіт» некаторы час слухаў прымаўкі і жарты жанчын, а потым накіроўваўся на выхад. Жанчыны пачыналі збіраць рукамі збожжа, раскіданае па падлозе і ссыпаць яго ў невялікія збаночкі. Гэта было абавязковае дзеянне, без якога абрад далей праводзіцца не мог. На змену «сейбіту» у дзвярах з'яўляўся «касец» – мужчына, апрануты ўжо па-летняму. Каб падкрэсліць час дзеяння, ён меў на галаве саламяны брыль (капялюш). У яго руках была качарга, якая ўвасабляла сабою касу. Ён імітаваў касьбу: замахваўся качаргой, быццам бы касой на лузе: касіў пасеянае «сейбітам» збожжа. Пасля мужчыну таксама частавалі і спявалі для яго песні, бо трэба было і «касца» задобрыць. Ён з задавальненнем выпіваў гарэлкі, забіраў ў торбу пачастункі і накіроўваўся ў сенцы. Тым часам жанчыны збіралі "ўраджай".

Раптам каля дзвярэй адчуваўся нейкі грук і як быццам касьцельны звон. Адчыніліся дзверы і ў пакой уваходзіў яшчэ адзін цікавы персанаж, які трымаў ў левай руцэ мяшок, а ў правай – і мешалку. На мешалцы вісеў пусты чыгун, які і выдаваў касцельны звон ад кожнага ўдару аб падлогу. Гэта была жанчына, твар якой таксама закрывала маска: «… з белай шкуры, чорнымі выгінастымі бровамі, пасярэдзіне тырчаў прышыты нос, шчокі і вусны былі як бурак, з-пад хусткі віднеўся рыжы чуб, хутчэй за ўсё з лёну. Гаспадыні былі рады бачыць яе, гасцінна сустрэлі і празвалі яе "пані Сёрба"» [4, 120]. З'яўленне апошняга персанажа азначала, што неабходна заканчваць вечар, даесці і дапіць ўсё, што было на стале і прыбрацца ў хаце.

Гэты дзіўны, але цікавы абрад, паказвае ўвесь земляробчы цыкл, дзякуючы якому беларусы станавіліся "багатымі", г.зн. збіралі ураджай зерневых, гародніны, вырошчвалі лён і д. п. Звычайна гэты абрад праводзілі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пасля няўдалага года, які не прынёс багатага ураджаю. Зразумела, што ў вобразе «пані Сёрбы» – «істоты з “таго свету”, ад якой не вырачэшся і не пазбегнеш», беларусы ўяўлялі багіню Марану, а разам з ёй і свой лёс, наканаваны Нябёсамі.

Падчас распрацоўкі фрагмента тэатралізованага паказа, прысвечанага рэгіянальным асаблівасцям святкавання Масленіцы па прадмеце “Рэжысура свят”, менавіта гэта фальклорна-этнаграфічнае апісанне аднаго з абрадавых дзеяннеў было ўзята мною за аснову.

СПІС ВЫКАРАСТЫННЫХ КРЫНІЦ

1. Зямная дарога ў вырай/ уклад., прадм., пер. У. Васілевіча. – Мінск : Маст. літ., 1999. – 654 с. – (Беларускія народныя прыкметы і павер’і ; кн. 3.).

2. Катовіч, А.В. “Веснавыя святы: нарысы. У 2 кн. Кн. 1/Аксана Катовіч, Янка Крук; маст. У.У. Васюк, А.Л. Баранаў. – Мн.: Маст. літ., 2005 – 359 с. – [16] л. іл. (Беларускі народны каляндар).

3. Ліцьвінка, В.Д. «Святы і абрады беларусаў» / В.Д. Ліцьвінка. – Мн.: Беларусь, 1997. – 176 с.: іл.

4. «Ядраное жыта гаспадара кліча...»: каляндарны год у абрадах і звычаях / Т. В. Валодзіна, Т. І. Кухаронак - Мінск : Беларуская навука, 2015. - 356 с: іл. - (Традыцыйны лад жыцця).

Солоп Д. И., студент 512а группы
заочной формы обучения
Научный руководитель – Сочнева Е. С.,
кандидат педагогических наук, старший преподователь

## СОВЕРШЕНСТВОВАНИЕ ДОСУГА МЛАДШЕГО ШКОЛЬНОГО ВОЗРАСТА В ШЕСТОЙ ШКОЛЬНЫЙ ДЕНЬ

В настоящее время организации  досуга детей младшего школьного

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ